“Дзень жалобы, дзень спаткання з родам”

Радаўніцу карэспандэнты «Р» правялі на малой радзіме чалавека, дзякуючы мужнасці якога мы ўсе жывём на белым свеце

«А можа, гэта быў самы сапраўдны цуд… У тое, што я зараз скажу, можаце не верыць, але памяццю сяброў сваіх загінуўшых клянуся, што праўду кажу. Дзесьці за месяц да аварыі я прыехаў у Белую Сароку. І ноччу прысніў… Багародзіцу. Штосьці велічнае і велізарнае, асляпляльна ззяючае. Ні абрысу постаці, ні твару не бачыў, але я, трыццацігадовы і далёкі ад рэлігіі чалавек, чамусьці адразу зразумеў, што гэта Багародзіца. Раніцай расказваю пра гэта маме, а яна ў слёзы: «Не ведаю, сынок, да чаго такі сон...»

Чалавек, які казаў мне гэтыя словы чатыры гады таму, побач са мной. Яго мама, якой сын пра дзіўны сон расказваў, таксама. Усе разам мы стаім на парослай мурагом вясковай вулачцы і глядзім на іх родную хату. Якую жанчына, тады яшчэ маладая, поўная сіл і прагі да жыцця, разам са сваім чалавекам, якога вось ужо шосты год побач няма, будавала па бярвенцу, па дошчачцы. Хату, дзе пабачылі свет шасцёра іх дзяцей – тры хлопчыкі і тры дзяўчынкі. Як па заказе. Мы стаім тут ужо колькі хвілін, а з хаты ніхто не выходзіць нам насустрач, не кідаецца з абдымкамі да родных людзей, нічые постаці не мільгаюць за вокнамі. Ніхто і не выйдзе, ніхто не кінецца. Няма ў хаце вокан, няма жылога духу. І тое, што яна ўвогуле ацалела, што не з’ехала долу страха, не пайшлі ў зямлю вуглы, таксама можна лічыць цудам. Бо апошні раз гаспадыня выйшла, прыхапіўшы з сабой абразы, з яе дзвярэй 4 мая 1986 года – быў, кажа сёння яна, якраз Вялікдзень, але свянцонага яйка сям’я пакаштаваць не паспела. Так, праз сорак з нечым год пасля вайны, палешукі зноў прыпомнілі страшнае слова «эвакуацыя».

Хата, ля якой мы гамонім, стаіць у выселенай вёсцы Белая Сарока, пра якую яе насельнікі казалі, што яна апошняя ад Беларусі і першая ад Украіны: да мяжы цяпер ужо другой дзяржавы тут напрасткі меней кіламетра. А жылі ў ёй, пакуль на Чарнобыльскай АЭС, да якой адсюль 18 кіламетраў, не грымнула, Міхаіл Міканоравіч і Вольга Піліпаўна Шаўрэй, тут нарадзіліся іх дзеці Лёня, Ваня, Пеця, Таня, Марыя, Лена. І вось ужо чвэрць стагоддзя без аднаго года іх гняздо раскіданае, дзеці і іх маці могуць убачыць родныя сцены толькі некалькі дзён у год – на Радаўніцу жыхарам адселеных вёсак можна прыехаць на могілкі, дзе ляжаць іх родныя і блізкія. І шлях гэты — ад Нароўлі да Белай Сарокі — для іх горкі, сказаў бы нават – крыжовы. Бо прыстойная яшчэ шаша даўжынёй у сорак з нечым кіламетраў ідзе праз многія вёскі, якія напаткаў той жа лёс, што і Белую Сароку. Дзёрнавічы, Вяпры, Надтачаеўка, Ражава, Даўляды... Для нас з калегам, людзей нетутэйшых, гэта проста назвы, якія ледзьве чытаюцца на ржавых указальніках, свайго роду, прабачце за гэты выраз, экзотыка, «сталкераўскага» кшталту пейзажы – пустыя, з выбітымі вокнамі хаты, сельскагаспадарчая тэхніка, якая ўрасла ў зямлю, стромкія, у дзесяткі метраў вышынёй, асіны, што прараслі праз разбураныя стрэхі складоў і ферм. Для Вольгі Піліпаўны і яе сына Івана – родныя да болю мясціны, дзе жылі іх знаёмыя, блізкія, да якіх яны хадзілі на вяселлі, хрэсьбіны і хаўтуры. І да якіх ніколі ўжо не прыйдуць, а сустрэцца, калі пашчасціць, можна толькі на Радаўніцу.

— Бач, клёны мае зусім пасохлі. Мы з братамі з лесу іх насілі, садзілі, ваду лілі вёдрамі, бо тут у нас пясочак. Прыжыліся былі, а цяпер усё, нежывыя, — перарывае невясёлыя мае думкі Іван Шаўрэй і паказвае на ладныя ўжо дрэвы, што купкай стаяць ля яго хаты. Пакуль стаяць.

Іван Міхайлавіч, як бачу, за чатыры гады, што прайшлі з першай нашай сустрэчы, не моцна змяніўся. Нешматслоўны, каржакаваты, вусы і валасы гэтакія ж густыя і чорныя. Мацак. Сапраўдны паляшук, які будзе доўга запрагаць, але калі паедзе, то ўжо паедзе, які будзе доўга мераць, але калі ўжо адрэжа, то адрэжа, пераразаць не прыйдзецца. Гледзячы на якога ніколі і не падумаеш, што нават тое, што ён стаіць вось тут, побач з намі, нешта нам расказвае, пяшчотна туліць да сябе дачушку Ангелінку,

увогуле на свеце жыве, ужо цуд. Бо не было яшчэ, наколькі мне вядома, выпадкаў, каб чалавек атрымаў дозу 500 рэнтгенаў і застаўся пасля гэтага жыць, — да Чарнобыля медыцына сцвярджала, што смяротнымі для чалавека з'яўляюцца ўжо сто рэнтгенаў.

Але менавіта таму, што Іван Шаўрэй узяў на сябе гэтыя пяцьсот рэнтгенаў, яго браты Леанід і Пётр, іх швагер Сяргей Лягун — яшчэ 1400 на ўсіх, іх камандзір Валодзя Правік — 1200, засталіся жыць і мы з вамі. А наша Беларусь, вецер на якую 26 красавіка 1986 года дзьмуў якраз ад Чарнобыля, не стала суцэльнай зонай адсялення...

«Дыспетчар Сяргей Лягун, мой швагер, глянуў на пульт і самлеў – уся сістэма супрацьпажарнай бяспекі выйшла са строю. А потым такі нібыта выдых, падобна на выкід пары, да якіх мы ўжо прывыклі і ўвагі не звярталі. Я выскокваю на вуліцу, і тут як трасяне! Два выбухі ўнутры, і потым трэці, які расшкуматаў дах чацвёртага блока... Гэты вогненны шар у мяне і сёння перад вачамі... Вышыня станцыі – семдзесят адзін метр, а шар гэты, вогненна-чорны такі, вісеў яшчэ метрах у ста над ёй. Выбух быў такой моцы, што жалезабетонныя пліты раскідала на сотні метраў наўкола. Сяргей Лягун уключыў сігналізацыю, і мы... пайшлі... туды...»

Гэтыя словы запісаны на маім дыктафоне таксама чатыры гады назад – Іван Міхайлавіч Шаўрэй расказваў мне, як камандзір другога аддзялення пажарнага каравула ваенізаванай пажарнай часці Чарнобыльскай АЭС Іван Шаўрэй 26 красавіка 1986 года разам з начальнікам каравула Уладзімірам Правікам, братам Лёнем пайшлі туды... На дах чацвёртага блока АЭС. Як подбегам, з цяжкімі пажарнымі рукавамі на плячах, падняліся па лесвіцы на семдзесят адзін метр і сталі на чацвёртым блоку па раду, як кажа Іван Міхайлавіч, «А». Як потым зноў спусціліся з блока, зноў падняліся, зноў разгарнулі свае гэтыя рукавы ўжо на радзе «Б» і зноў, у суцэльным дыме і пры пякельнай тэмпературы, залівалі вадой палаючыя кавалкі графіту, тапталіся па іх самі... Праз некаторы час да іх далучыліся калегі-пажарныя з горада Прыпяць: Віктар Кібянок, Уладзімір Цішура, Мікалай Ціцянок, Мікалай Вашчук, Васіль Ігнаценка.

З імі Іван Міхайлавіч ужо не сустрэнецца ніколі – яны засталіся толькі ў гісторыі, яны самі – гісторыя. Горкая, як палын.

«Мы пратрымаліся дзесьці каля гадзіны. Хлопцаў Кібянка, Вашчука, Ігнаценку ўжо забіраюць. І тут мяне павяло – паплыў. Выехалі за вароты атамнай, у Прыпяці ў медсанчасці вядуць у душ, але мы ўжо нічога не разумелі, валіліся прама ў душавых».

А ў ціхай Белай Сароцы раніцай 26 красавіка Міхаіл Міканоравіч і Вольга Піліпаўна чакалі сыноў і дачок – дамовіліся, што пасадзяць бульбу. Сонца ўжо высока, а дзяцей няма. Ужо хмурыцца, бурчыць нешта сабе пад нос бацька – што ж гэта, маўляў, такое, ніколі ж не было, каб хлопцы паабяцалі нешта, а самі не зрабілі. Супакойвала, як магла, свайго чалавека жонка, але і ў самой сэрца ціснуць пачало – не тое нешта робіцца.

— І не памятаю ўжо, як і чаму, але ж пайшла раптам пагалоска, што станцыя гарэла. Потым нехта бацьку сказаў, што хлопцы нашы, Лёня, Пеця, Ваня і зяць Сяргей ці абгарэлі, ці патруціліся. Бацька на матацыкл і ў Прыпяць. Не пускаюць. Ён матацыкл у кусты, а сам сцежкамі, сцежкамі пешшу ў горад. Прабраўся, знайшоў Ваню... І колькі ён у бальніцы той ляжаў, столькі Міканоравіч мой да яго і прабіраўся. Па тры разы на дзень паспяваў. Малако казінае вазіў, ледзь не сілком піць застаўляў. Зёлкі ў мяне, не помню ўжо якія, былі, я яму давала, казала, каб даваў Ваню. Яны, мусіць, і дапамагалі. Божанька дапамог – так мы яму маліліся, так прасілі, каб дзетак нашых без пары не прыбіраў...

Гэта ўжо Вольга Піліпаўна. Мы з ёй сядзім на лавачцы ля магілак родных ёй людзей, размаўляем. Раз-пораз перарываемся – падыходзяць да жанчыны людзі, былыя яе аднавяскоўцы, якіх па свеце раскідала і якія таксама прыехалі да сваіх родных, яны абдымаюцца, цалуюцца, выціраюць хусцінкамі слёзы. Людзей, як мне падаецца, даволі многа стаіць ля могілак, што размясціліся ў светлым сонечным сасонніку, дзесяткі два легкавікоў, увіхаюцца ля крыжоў і агароджаў і старэйшыя, і маладзейшыя.

— Не, дзеткі, менее нас з кожным годам. Старэем мы, сыходзім. Вязуць сюды ўжо не ўсіх. Раней, калі думалі, што

вернемся, яшчэ везлі, а цяпер – не, хаваюць там, дзе жывуць.

Вользе Піліпаўне – восемдзесят два, больш чым сталы ўзрост і цяжкае, нялёгкае жыццё. Яна невысокая, зграбная, у яе баляць ногі, а вочы – такія жывыя і з такой спагадай глядзяць на цябе, што адразу, хоць і знаёмы з ёй нейкую гадзіну, разумееш, – яе дабрыні і ласкі хапала ўсім шасцярым дзецям, менавіта яны былі для яе святлом у акенцы. Зараз яна жыве ў Кіеве, там яе сыны, Лёня і Пеця, сястра, на Украіне жывуць і дочкі, а сюды прыехала з Іванам, яго жонкай Наташай, іх дзецьмі — Арцёмам і Ангелінай.

— Вось тут мой тата, Піліп Рыгоравіч, побач – мама, Агрыпіна Кузьмінічна, — Вольга Піліпаўна паказвае на агароджы, якія фарбуе Іван, і уздыхае: — Бацька наш памёр за тры месяцы да вайны, зусім маладым, нас у мамы васьмёра было. Цяпер толькі я і сястра засталіся. Брат Якаў тут ляжыць, Міша – у Ленінградзе, Андрэй – у Калінкавіцкім раёне, Лёня – у Пінску. Увесь наш род па свеце раскідала, дзякуй Богу, дзеткі мае ацалелі...

Чаму яе дзецям, схапіўшым такія страшэнныя дозы смяротнай радыяцыі, пашчасціла застацца жывымі, жанчына, вядома ж, не ведае. Не ведае яна мудрагелістых навуковых тэрмінаў «гены», «супраціўляемасць арганізма», «пункцыя спіннога мозгу». Цвёрда ведае другое: яе дзеці ніколі і нікому ў жыцці дрэннага не зрабілі, шанавалі іх, сваіх бацькоў, самую цяжкую работу заўсёды стараліся ўзяць на свае плечы, не капрызілі і не нэндзілі, елі тое, што ставілі на стол, і не выбіралі кожны для сябе лепшае месца ў цеснаватай хаце. Магчыма, думае маці, усё гэта ім і залічылася.

«Мне неяк давялося папасці ў палату да Валодзі Правіка. Заходжу, ён ляжыць пад прасцінкай. Негр... Чорны-чорны... Вусны распухлі... Маці яго побач, націрае яблыкі. Валодзя мне: «Міхалыч, вазьмі з'еш за мяне...» Я гэтыя словы ўсё жыццё памятаць буду... Адзін Валодзя з нашага каравула і памёр. Ён у рэактарную залу заходзіў, вялікую дозу схапіў... Страшна паміралі хлопцы... Я тры крызісы перанёс. Пасля апошняга, калі яшчэ і падняцца не мог, прыходзіць урач наш Аляксандра Фёдараўна Шамардзіна і віншуе мяне з днём нараджэння. Я здзівіўся, дзень нараджэння ў мяне ў снежні, а яна кажа: «Сынок, ты будзеш жыць!» Я заплакаў...»

Гэта зноў дыктафонная стужка. Расказ Івана Шаўрэя аб тым, як ён вяртаўся з таго свету ў IV маскоўскай клініцы. Ён гэта здолеў, яго сябры, прозвішчы якіх я назваў, не здолелі. Іван Міхайлавіч зараз у Нароўлі, не надта каб вельмі здаровы, але жывы. Віктар Кібянок, Уладзімір Правік, Уладзімір Цішура, Мікалай Ціцянок, Мікалай Вашчук, Васіль Ігнаценка, такія ж, як ён, атамныя пажарныя, на Міцінскіх могілках у Маскве. Яны па-мерлі. Страшна, як кажа Іван Шаўрэй, памерлі. Каб жылі мы.

Мы жывём. Але ці заўсёды памятаем, дзякуючы каму бачым сонца і неба, сустракаем зімы і вёсны, ці ўсё зрабілі для таго, каб памяць жыла і тады, калі нас, сведак і ахвяр самай страшэннай тэхнагеннай катастрофы на зямлі, ужо не будзе? Чаму, спытаецеся, я так стаўлю пытанне? Адкажу, з вашага дазволу, кароткай вытрымкай са свайго артыкула чатырохгадовай даўнасці: «У Беларусі двое пажарных, якія захінулі нас з вамі і ўвесь свет ад Чарнобыля, – Васіль Ігна-ценка і Іван Шаўрэй. Васілю Ігнаценку стаіць помнік на радзіме, у Брагіне. У кожную гадавіну Чарнобыля да яго кладуцца кветкі, тут праходзяць мітынгі. Іван Шаўрэй жывы, але аб яго подзвігу мала хто ведае. Гэта мне падаецца няправільным. Уношу прапанову. Некалькі гадоў таму грамадская арганізацыя «Шчыт Чарнобыля» хадайнічала аб прысваенні звання Героя Беларусі (пасмяротна) Васілю Ігнаценку і верталётчыку Васілю Вадалажскаму, які зрабіў 120 вылетаў да рэактара і скінуў у яго 300 тон спецыяльнай сумесі. Па нейкіх прычынах ініцыятыва заглухла. Але зараз, напярэдадні 20-й гадавіны Чарнобыля, ёсць, мне здаецца, сэнс да яе вярнуцца. І спіс з двух загінуўшых дапоўніць адзіным жывым пажарным – Іванам Шаўрэем».

Дадаць да сказанага я нічога не магу. Толькі паправіць лічбу 20 на 24, а далей – па тэксце.

М.Кучко

Источник: Рэспубліка.-2010.-24 крас.(№74).-С.8-9.